■ Цікавае побач

# САМАВАР — ДУША ДОМА. А ЯНА НЕ ПРАДАЕЦЦА

## Так лічылі нашы продкі

**У этнакультурным комплексе «Наносы — Наваселле», што на Мядзельшчыне, працуе адзіны ў Беларусі музей самавараў. У яго калекцыі каля 600 розных мадэляў. Такой разнастайнасці і колькасці можа пазайздросціць нават аналагічны музей, што створаны на радзіме самавараў — у Туле.**



У адной з залаў музея.

— Гісторыя самавараў пачалася ў 1740 годзе. Менавіта тады на мытні горада Екацярынбурга затрымалі групу купцоў. У іх адабралі 6 кадушак мёду і цікавую пасудзіну пад назвай «самавар». Хоць у яе былі і іншыя найменні: вадагрэй, самакіпец і нават — таўстапузае бажаство. Людзі верылі, што самавар прыносіць у дом шчасце, удачу, спакой. Самыя першыя самавары выкарыстоўваліся не для чаю, а для прыгатавання збіценю, — распавяла экскурсавод Валерыя Ёдчык. — Іх рабілі з медзі, якую здабывалі на Урале. Яе было так многа, што пачалі будаваць заводы, фабрыкі па вытворчасці меднага посуду. Нягледзячы, што такіх прадпрыемстваў узнікла шмат, посуд усё роўна быў вельмі дарагі. Напрыклад, каб купіць чайнік, трэба было цалкам утрамбаваць яго сабалінымі шкуркамі.



Экскурсавод Валерыя Ёдчык ведае пра самавары ўсё.



Самавар-паравоз.

Фота Надзеі БУЖАН.

Самавары ў музеі — самыя розныя, часам незвычайныя і мудрагелістыя. Напрыклад, на адной з вітрын змешчана звычайная труба.

— На першы погляд, нібыта самавар. Але не зусім так. Гэта спецыяльная ёмістасць для каньяку, — тлумачыць Валерыя. — Асаблівасць прыстасавання ў маленькім непрыкметным кране, накшталт будыйскага сімвалу: нічога не бачу, не ведаю, нічога нікому не скажу. Зроблена гэта для таго, каб нагадаць людзям, што каньяк развязвае язык, а тое, пра што гаварылася за сталом, тут павінна і застацца.

А вось яшчэ цікавыя і ўнікальныя самавары: у выглядзе пеўняў, рога багацця, крэйсера, сумнавядомага «Тытаніка», паравоза. Яны адлюстроўваюць развіццё тэхнікі і навуковага прагрэсу, зроблены па індывідуальным заказе і таму маюць асобы статус. Асноўнае прызначэнне самавараў-бульётак не нагрэць ваду, а падтрымліваць яе ў гарачым стане звычайна з дапамогай спіртоўкі або газніцы. Для іх вырабу часта выкарыстоўваліся і падручныя матэрыялы, пра што сведчыць вялікая прылада з двух медных тазікаў. Усе настолькі хацелі мець адметныя, не такія, як у суседзяў, самавары, што прыдумлялі незвычайныя формы.

Сталіцай самавараў лічыцца Тула. А пачатак іх вырабу паклалі збройнікі. Вытворцы зброі багацелі, грошы трэба было некуды ўкладваць. Менавіта выпуск самавараў стаў перспектыўнай і прыбытковай справай.

У XIX стагоддзі наяўнасць самавара павышала статус дома. Лічылася, той, хто яго мае, — заможны чалавек. Усе імкнуліся купляць два, тры самавары. Карысталіся адным, астатнія былі выстаўлены напаказ, маўляў, глядзіце, якія мы багатыя гаспадары. Бясспрэчна, дазволіць сабе такую раскошу маглі далёка не ўсе. На той час сялянскі дом каштаваў 7 рублёў, мяшчанскі — 20, а самавар — ад 7 да 15 рублёў. Гаспадыня часцей за ўсё прадавала сваё жытло, а не самавар, таму што ён лічыўся душой дома, а душа не прадаецца.

**На пачатку XIX стагоддзя ў Туле налічвалася каля 25 самаварных фабрык. Але самымі вядомымі вытворцамі былі браты Баташовы. Яны разумелі, што самавар каштуе дорага і не кожны можа ім абзавесціся. Таму спрасцілі канструкцыю і паставілі выпуск на паток. У выніку цана зменшылася і самавары рэалізоўваліся вялікімі партыямі.** Дзякуючы братам, доўгачаканая рэч нарэшце з'явілася амаль у кожнай сям'і. Самыя бедныя куплялі яго ў складчыну або нават адзін на ўсю вёску. Калі ў хаце адбываліся хрысціны, вяселле, самавар часова перадаваўся гаспадарам. Але пры гэтым заварвала чай прызначаная захавальніца: лічылася, што самавар слухаецца толькі адных рук.

— Сама гісторыя братоў Баташовых таксама вельмі цікавая. Упершыню заснаваў фабрыку ў 1840 годзе галава сям'і Сцяпан Баташоў, але яна згарэла. Ён не перажыў страты і памёр. Яго старэйшы сын Васіль (на той час яму было 19 гадоў) разам з малодшым 13-гадовым Аляксандрам аднавілі справу бацькі. На ўсіх усерасійскіх выставах яны заваёўвалі залатыя медалі. Нездарма іх называлі каралямі самаварнай справы. Браты мелі права адціскаць на сваім вырабе знак дзяржаўнага герба. Яго мог ставіць той вытворца, які пастаўляў сваю прадукцыю да двара. Гэтага гонару былі ўдастоены адзінкі. Такія самавары прадаваліся на ўра: кожны пакупнік думаў, раз з яго п'е сам цар, то і мне трэба мець такі, — гаворыць Валерыя Ёдчык.

Дарэчы, чалавек, які сабраў гэтую калекцыю, нарадзіўся 28 сакавіка, і ў Аляксандра Баташова дзень нараджэння 28 сакавіка. У Валерыі, якая зацікавілася гісторыяй самавараў і праводзіць экскурсіі для шматлікіх гасцей, таксама дзень народзінаў 28 сакавіка. Супадзенне або заканамернасць?

Абсалютна ўсе вытворцы тульскіх самавараў імкнуліся ўдзельнічаць у выставах, дзе маглі атрымаць 1, 2, 3 месцы і адпаведна залатыя, сярэбраныя, бронзавыя медалі. За чацвёртае месца давалі пахвальны ліст. Медалі былі вельмі вялікія, цяжкія і выставіць іх напаказ было праблематычна. Тады прыдумалі рабіць іх адбіткі на самім вырабе. Вядома, чым больш медалёў, тым даражэйшы самавар. І ўсе самаварныя спраў майстры імкнуліся займець як мага больш медалёў. Часам прыбягалі да хітрыкаў: з медаля, што ўдавалася заваяваць падчас выставы, рабілі некалькі адбіткаў на самавары. І ніхто на гэта не звяртаў увагі. А вось зарабіць гонар змяшчаць герб на сваіх вырабах было значна цяжэй. Але і тут прадпрымальныя людзі знайшлі выхад. Справа ў тым, што адваротны бок медаля ўпрыгожваў дзяржаўны герб. Сімволіку павялічвалі ў памерах, адціскалі ў цэнтры самавара.

Бясспрэчна, прадукцыя братоў Баташовых стала брэндам. Таму многія вытворцы карысталіся іх імем, знаходзілі людзей з аналагічным прозвішчам, плацілі ім невялікія грошы і ставілі «Баташоў» на самавары (а ў дужках — вельмі маленькімі літарамі прозвішча сапраўднага вытворцы). Таму сёння можна ўбачыць шмат нашчадкаў, пераемнікаў, захавальнікаў ідэі Баташовых. Калі братам надакучыла такое махлярства, яны звярнуліся ў суд. У выніку быў складзены спіс з 30 чалавек, якія незаконна выкарыстоўвалі прозвішча Баташоў. Але прыйшла рэвалюцыя, і ўсё прыватнае стала грамадскім. І на прадукцыі тульскіх патронных завода, завода «Штамп» не было неабходнасці пісаць імя братоў Баташовых.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■

# «Лявоніха» на беразе Ангары

## Тры складнікі поспеху беларускай дыяспары ў Іркуцку

**Пра аднаго з самых актыўных беларусаў замежжа, стваральніка Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага Алега РУДАКОВА я чула даўно, а вось пазнаёміцца асабіста выпала на VI з'ездзе Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі ў Маскве. Спадар Алег распавёў шмат цікавых рэчаў пра дзейнасць нашых суайчыннікаў у Прыбайкаллі.**

***— Беларуская супольнасць у Іркуцку лічыцца адной з самых актыўных і прадуктыўных у Расіі. Як вам гэта ўдаецца?***

— Перш за ўсё, мы лічым, што кожная беларуская суполка павінна вывучаць беларускую мову, бо гэта — аснова нашага народа. Па-другое, вывучаць і праводзіць беларускія народныя святы, бо гэта адначасова і інтэрактыўны, і захаванне традыцый, а разам з тым узнікае патрэба і ў нацыянальных строях, і ў танцах, і ў рамёствах... Усё гэта мы робім у комплексе падчас праваджэння народных святаў. Бо пад што людзям танцаваць на Купалле — пад «бугі-вугі» нейкія? Гэта нецікава. А «Лявоніха», полька, «Кракавяк» — іншая справа. Мы ўсё гэта вывучаем, я сам праводжу майстар-класы, магу і вас навучыць — ведаю 20 беларускіх танцаў як народных, так і сярэднявечных.

А трэці складнік — гэта гістарычная спадчына. Бо калі ты не ведаеш гісторыю свайго народа, ты не шануеш сваіх продкаў. Я, нават калі ў арміі служыў яшчэ за савецкім часам, заўважаў: напрыклад, два ўкраінцы сустрэнуцца — і яны ўжо сябры, іх вадой не разальеш. А беларусы сустрэнуцца: «Здароў!» — «Здароў!» — «Ты адкуль?» — «З-пад Гомеля!» — «А я — з-пад Полацка!» — і разышліся. Такія ўжо нейкія некампанейскія беларусы! А ўсё таму, што мы не ведаем сваёй гісторыі. І калі я пачаў яе вывучаць, зразумеў, якія намаганні рабілі продкі, каб наш народ захаваўся. Столькі было войнаў, столькі ворагаў захоплівалі нашу тэрыторыю, і нягледзячы ні на што, беларускі народ выстаяў. І калі нашы продкі захавалі для нас культуру, то цяпер наша задача — зрабіць гэта для нашчадкаў. І вось калі кожная беларуская суполка возьме за аснову тры складнікі, гэта дасць магчымасць актыўна працаваць і далучаць да сябе моладзь.

***— Так, апроч іншага, вядома, што сярод іркуцкіх беларусаў шмат актыўнай моладзі.***

— Увогуле ў Іркуцку ўжо тры беларускія суполкі, у якія агулам уваходзіць каля 1,5 тысячы чалавек. Ва ўсіх ёсць свой актыў, бо мы разрасліся, лідараў шмат, і ў кожнага з іх ёсць жаданне сябе праявіць. Апроч таго, у нас ёсць аддзяленні беларускіх суполак па Іркуцкай вобласці, гэта вынік маёй 19-гадовай працы. Цяпер я ўжо нават не старшыня ніводнай з суполак, проста актыўна працую ў моладзевым клубе «Крывічы».

***— Раскажыце падрабязней пра мерапрыемствы, якія вы ладзіце.***

— Мы нядаўна правялі беларускі «Кірмаш». На яго прыехалі 14 беларускіх ансамбляў з некалькіх раёнаў вобласці: ад Тайшэцкага раёна з беларускай вёскі Чарчэт да горада Слюдзянка, што на самым поўдні ўзбярэжжа Байкала. Гэта быў марафон міні-праграм розных калектываў, які цягнуўся больш за сем гадзін. Свята такога маштабу ў Іркуцку праводзілася ўпершыню.

Паралельна праходзілі майстар-класы па саломапляценні, выцінанцы, вырабах з гліны і бярэсты і лялек-абярэгаў... Вядома ж, былі і танцы! А яшчэ — стравы беларускай кухні, кірмаш беларускіх тавараў і забаўляльная праграма для дзяцей.

***— Сапраўды маштабна! А што вы думаеце пра актыўнасць іншых беларускіх суполак у Расіі?***

— Я бачу, што паступова большасць суполак у Расіі, нават тыя аб'яднанні, што ўтвараліся як проста зямляцкія, ужо годна прадстаўляюць беларускі народ. Яны маюць свае гурты, клубы, друкаваныя органы, і такая праца пашыраецца. Мне гэта вельмі прыемна.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

*г. Масква.*